ному делу). Традиции шиловского лозоплетения сегодня продолжает предприятие ООО «Шиловская лоза», где для туристических групп проводятся мастер-классы по обучению различным приемам лозоплетения. Кроме того, в Скопине проходит международный фестиваль гончаров, а в Михайлове – фестиваль кружевоплетения и вышивки «Не блекнут краски старых кружев».

Для туристов действует программа «Народные промыслы Рязанской глубинки» (пункты программы: Рязань – Михайлов / Скопин / Шилово).


1. Государственный архив Рязанской области (ГАРО). Фонд 5. – Оп. 2. – Д. 2099. Материалы об открытии помещицей Е.Н. Половцевой школы кружевниц в с. Борисовка Скопинского уезда (отчеты, правила, рапорты, переписка), (25 декабря 1894 – 12 марта 1897).
2. Абушенко Н.А. История основания Мариинской практической школы кружевниц / Н.А. Абушенко // Традиционное прикладное искусство и образование: материалы X научно-практ. конф., декабрь 2009 г. / под ред. М.Ю. Спириной. – СПб., 2005. – С. 11–15.
3. Алексеев Б. Народное искусство Рязанской губернии и изучение его краеведческими научными центрами / Б. Алексеев // Вестник рязанских краеведов. – 1923. – Вып. 4. – С. 8–13.
4. Бушкова Д.В. Традиционные художественные промыслы – важная составляющая национального культурного наследия / Д.В. Бушкова // Культура России в XXI веке: прошлое в настоящем, настоящее в будущем: материалы V Междунар. науч. студ. конф., 6–7 мая 2009 г.: в 2 т. / под ред. С.И. Назаровой. – СПб., 2009. – Т. 2. – С. 94–97.
5. Каталог кустарных изделий Рязанской губернии, экспонируемых на Второй Всероссийской кустарной выставке 1913 г. – Рязань, 1913.
6. Максимова С. Особый промысел: Народные ремесла должны стать важной составляющей формирующейся в регионе туристической индустрии / С. Максимова // Рязанские ведомости. – 2011. – 15 сент. – С. 3.
7. Низшее ремесленное образование в Рязанской губернии. Вып. 1. – Рязань, 1913.
8. Половцова Е. К вопросу о развитии кустарного кружевного промысла в Рязанской губернии / Е. Половцова // Вестник Рязанского губернского земства. – 1914. – № 2. – С. 3–20.
9. Резолюция парламентского форума «Историко-культурное наследие России» // Аналитический вестник Совета Федерации Федерального Собрания РФ. – 2009. – № 10 (377). – С. 67–75.
10. Русское народное искусство на Второй Всероссийской кустарной выставке в Петрограде в 1913 г. – Репринтное издание 1914 г. – СПб., 2008.
11. Рязанская область: туристские ресурсы, инвестиционные предложения. – Рязань, 2008.
12. Рязанская область: туристический каталог. – Рязань, 2009.
13. Рязанский край. Наше наследие: иллюстрированное издание. – Рязань, 2009.



**Півавар М.В.**


## ДОСВЕД ЗАХАВАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНСКАЙ КАМІСІІ ПА АХОВЕ ПОМНІКАЎ ДАЎНІНЫ (1920–1921 гг.)


Віцебск, Рэспубліка Беларусь


Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны мае надзвычай важнае значэнне для краіны. У справе арганізацыі аховы варта звяртацца




Репозиторий ВГУ

да досведу папярэднікаў. Першым дзяржаўным органам аховы на Віцебшчыне, які займаўся зберажэннем помнікаў даўніны з'яўлялася Віцебская губернская Камісія па ахове помнікаў даўніны і прадметаў (рэчаў) мастацтва, якая дзейнічала з студзеня 1920 – па мяжу мяжа 1921–1922 гг. Не гледзячы на не доўгі тэрмін існавання камісіяй былі зроблены досыць істотныя крокі па ахове культурнай спадчыны. На жаль, дзейнасць камісіі не стала прадметам асобнага даследавання. Выключэннем выглядае артыкула Л. Хмяльніцкай. Дакументальных сведчанняў дзейнасці захавалася не шмат. У асноўным яны знаходзяцца ў фондзе 1947 (Віцебскі абласны краязнаўчы музей) Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. Мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне таго станоўчага досведу ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, які мела дзейнасць Віцебская губернская Камісія па ахове помнікаў даўніны на працягу 1920–1921 гг.

Пасля Лютаўскай, а яшчэ больш пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на абшарах былой Расійскай імперыі распачынаецца масавае рабаванне і знішчэнне панскіх сядзіб і гаспадарак. Не разглядаючы глыбінных прычын трагічных падзей, пагодзімся з А. Блокам, які ў артыкуле "Интеллигенция и революция" пісаў "Почему жгут барские усадьбы? Потому, что пороли и насиловали девок".

З мэтай выяўлення і захавання мастацкіх каштоўнасцяў, якія няшчадна рабаваліся і знішчаліся ў РСФСР 9.12.1917 г. у адпаведнасці з дэкрэтам У.І. Леніна быў утвораны Народны камісарыят гістарычных маёмасцяў (исторических имуществ). У яго складзе была ўтворана Калегія па ахове помнікаў (са жніўня 1918 г. яна была перададзена ў наркамат асветы). Такія ўстановы ствараліся на месцах – у губернях. У выключных выпадках губернскія пададдзелы маглі ўтвараць пададдзелы і музеі ва ўездных гарадах [1].

У Віцебску губернская камісія па ахове помнікаў даўніны і рэчаў мастацтва была створана ў студзені 1920 г. пры губернскім аддзеле народнай адукацыі. У навукова-мастацкіх адносінах яна знаходзілася пад кіраўніцтвам Усерасійскай калегіі па справах музеяў і аховы помнікаў мастацтва і даўніны.

У склад камісіі ўваходзілі прадстаўнікі губаддзела асветы; губархіва; Інстытута народнай адукацыі (так з лістапада 1919 г. пачаў называцца Віцебскі педінстытут); польскай, яўрэйскай секцый ЦК РКП(б); Віцебскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута; Віцебскага аддзялення Маскоўскага таварыства па даследаванні помнікаў даўніны. Старшынёй губкамісіі з'яўляўся Аляксандр Георгіевіч Ром, намеснікам Уладзімір Мікалаевіч Юрэньеў, сакратаром Тэя Брахман. У склад таксама ўваходзілі 6 супрацоўнікаў і 3 інструктараў для раз'ездаў. У складзе губкамісіі працавалі тры камісіі: па манументальнай ахове помнікаў Віцебска і губерні (ст. А. Ром); музей-



Рэпазіторый ВДУ

ная (заг. губмузея А.Р. Брадоўскі); этнаграфічная (С. Юдовін). Сярод супрацоўнікаў быў і выдатны віцебскі гісторык – А.П. Сапуноў. Камісія збіралася штотыдзень па аўторках.

Сярод галоўных мэт і задач камісіі вызначым наступныя: ахова помнікаў, рэгістрацыя і ўзяцце на ўлік мастацкіх каштоўнасцяў, кіраванне музейнай справай, стварэнне губернскага музейнага фонду, нагляд за археалагічнымі і рэстаўрацыйнымі работамі, правядзенне ў жыццё пастаноў Усерасійскай калегіі па ахове помнікаў і іншыя.

У адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі і вызначанымі задачамі камісія працавала ў некалькіх накірунках. Першачарговай задачай з’яўлялася ***захаванне рэчаў мастацтва былых памешчыцкіх сядзіб***. З гэтай мэтай была наладжаны нагляд за найбольш значнымі сядзібамі ў наваколлях Віцебска, у тым ліку палаца Цэханавецкіх у м. Бачэйкава (наглядаў М.І. Красавіцкі), палаца Храптовічаў-Буцянёвых у м. Бешанковічы; сядзібах Н.Д. Хлюсціна ў в. Адаменкі [2], Косавых у ф. Лукішкі, М.В. Друцкай-Сакалінскай у в. Мазалава, дома Цэханавецкіх у Бабінавічах [3], Перамонт, Іванава Невельскага павета. Асабліва клапаціліся прадстаўнікі камісіі пра лёс бібліятэк з былых сядзіб. На працягу 1920 г. была вывезена бібліятэка французскіх і італьянскіх аўтараў XVII–XVIII ст. з сядзібы Лескавічы [4], перададзена бібліятэка Духоўнай семінарыі у якую ўваходзілі кнігі езуіцкага калегіума. Планавалася браць пад ахову не толькі сядзібы, але і найбольш каштоўныя храмы, у тым ліку і касцёл у в. Вял. Лётцы і іншыя аб’екты.

З мэтай агляду сядзіб, а таксама збору рэчаў матэрыяльнай і духоўнай культуры (казак, легенд, паданняў, мелодый і інш.) арганізоўваліся этнаграфічныя экспедыцыя. У 1920 г. С. Юдовін быў накіраваны ў экспедыцыю ў Гарадок. У жніўні 1921 г. ён жа накіроўваўся ў Бешанковічы з мэтай агляду палацава-паркавага комплексу Храптовічаў-Буцянёвых. У паланах было агледзіць каменную бабу у Крынках і Адамішках і вывезці ў Віцебск [5].

Важнай задачай працы камісіі з’яўлялася ***ахова помнікаў***. Была арганізавана ахова помнікаў археалогіі, пачалося складанне археалагічнай карты губерні. Быў складзены “Спіс будынкаў г. Віцебска, падлягаючых ахове Камісіі”. Камісія запланавала выдаць ілюстраваны пуцяводнік па Віцебску. Да працы над выданнем далучыліся А. Сапуноў, Т. Кібардзін, Эль Лісіцкі. Напісанне нарысу замовілі вядомаму спецыялісту Г.К. Лукомскаму. Тыя рэчы мастацтва, якія знаходзіліся на прадпрыемствах браліся пад улік. Напрыклад, у клубе імя К. Лібкнехта на заводзе Лістоўскага былі ўзяты на ўлік 2 карціны маслам Ю. Клевера [6].

Камісія праводзіла значную ***асветніцкую працу***. Значныя мерапрыемствы былі запланаваны ў сувязі са святкаваннем 900-годдзя



Репозиторий ВГУ

Віцебска ў 1921 г. Сярод іншых мерапрыемстваў: правесці ўрачыстае пасяджэнне ў Палацы Працы са святочнай праграмай (даклады, светамалюнкі), лекцыі па гісторыі архітэктуры Віцебска. Планавалася выдаць брашуру прысвечаную гісторыі Віцебска "Гісторыі горада Віцебска" (задумана была яшчэ ў 1917 г., т.я. у студзені 1918 г. была выдадзена падпіска на яго выданне), выдаць альбом "Стары Віцебск", які бы ўключаў фота будынкаў, іх планы, абмеры [7]. Планавалася выданне серыі ілюстрацый (ксілаграфій і лінагравюр) прысвечаных Віцебску. Абвешчаны конкурс на лепшы праект помніка прысвечаны 900-годдзю горада.

З мэтай павышэння ўзроўню культуры мясцовых жыхароў у адносінах да помнікаў даўніны камісія планавала правядзенне шэрагу выстаў. У 1920 г. С. Юдовіным была арганізавана выстава яўрэйскай народнай творчасці. Яна была аформлена з рэчаў, што знаходзіліся ў клубе Барухава (матэрыялы экспедыцыі Ан-скага) і матэрыялаў яўрэйскай тэматыкі з музея А. Брадоўскага [8]. Планавалася правядзенне і выстаў класічнага мастацтва.

Важнай задачай, якая паўстала перад камісіяй была ***музейнае будаўніцтва***. Да рэвалюцыі ў горадзе не было дзяржаўнага ці грамадскага музею, але было некалькі вялікіх прыватных збораў. У выніку Першай сусветнай вайны ў Віцебску апынуліся збор Віленскага вайсковага сходу і прыватны музей А. Брадоўскага. На аснове апошняга быў арганізаваны *губернскі музей* пры аддзеле народнай адукацыі.

Адной з галоўных задач Віцебскай губкамісіі з'яўлялася стварэнне пры губмузеі аддзела, прысвечанага *Вялікай Рускай Рэвалюцыі*. Па планах натхняльнікаў ён павінны быў паўстаць на аснове галоўным чынам друкаваных матэрыялаў. Была распрацавана інструкцыя для збору матэрыялаў, у якой удакладнялася, якая інфармацыя павінна збірацца ў першую чаргу: газеты, журналы, карыкатуры, лісты, запіскі і дзённікі, матэрыялы для біяграфій удзельнікаў рэвалюцыі, вершы, байкі, сатыры, частушкі прысвечаныя рэвалюцыйным падзеям, плакаты, пракламацыі і іншыя матэрыялы. У інструкцыі аўтары пісалі: "Мы не в силах оценить всего, что происходит в стране, … наши записи и сообщения в печати представляют неоценимый материал для будущих историков. На нас лежит обязанность сохранить как можно больше фактов, документов и предметов, характеризующих события Великой Русской Революции" [9]. Праз пэўны час было вырашана ўтварыць асобны музей. Праца па арганізацыі музея Рэвалюцыі пачалася ў ліпені 1920 г. Яна праводзілася разам з упаўнаважаным Петраградскага музею рэвалюцыі Хайкіным. Музей планавалася стварыць у бібліятэцы 29-й школы 2-й ступені. Сюды былі дастаўлены матэрыялы з падвала пры клубе 1-га мая і бібліятэка Віцебскага



Рэпозиторий ВГУ

ваеннага сходу [10].

Разам з вышэй азначанымі камісія брала ўдзел у стварэнні *музея сучаснага мастацтва* [11]. Прапаноўваўся праект краёвага *музея побыту, кустарнай прамысловасці і рэчаў*, якія характарызуюць рэвалюцыйны перыяд [12]. Вялася праца па арганізацыя музея на аснове калекцыі В. Федаровіча. Улічваючы спецыфіку сабраных матэрыялаў, прадугледжвалася стварэнне на яго аснове "*Музея Беларуска-польскай даўніны*". М.М. Багародскі прапаноўваў стварыць *музей друку* [13]. Дзеля гэтага планавалася звярнуцца ў губдрукарню, каб агледзіць рэчы,што знаходзяцца на гарышчы. Камісія прыкладала намаганні арганізаваць і сістэматызаваць працу ведамасных музеяў, якія арганізоўваліся самастойна. Напрыклад, з архіўных звестак вядома пра існаванне ў Віцебску *музея Губпродкома*. М.М. Брадоўскім з мэтай далучэння да працы ў камісіі прапанаваў увесці ў склад членаў камісіі яго дырэктара [14].

У музейным будаўніцтве не ўсё складвалася проста. Спецыялісты з Петраграда, Масквы таксама праводзілі росшукі найбольш каштоўных калекцый, шмат рэчаў экспрапрыіравалася на фінансаванне ажыццяўленне сусветнай рэвалюцыі. Прыходзілася і змагацца за тое, каб мясцовыя калекцыі аставаліся ў межах губерні. Так, на пачатку 1920 г. камісія хадатайнічала аб тым, каб вярнулі ў горад калекцыю Ляхніцкай, якая была вывезена ў Цэнтр у сувязі з наяўнасцю у ёй залатых і сярэбраных рэчаў [16]. Часта спробы музейнага будаўніцтва сутыкаліся і з сабатажам на месцах. Напрыклад, камісіі стала вядома, што ў Полацку знаходзяцца 13 скрыняў з экспанатамі з Сібіры (естественно-историческим материалом): тушкі і скуркі птушак), якія захоўваліся ў падвале Полацкіх педагагічных курсаў. Планавалася вывезці іх у натуральна-гістарычны музей у Віцебск, аднак з прычыны супраціву мясцовага выканкама, інспірыраванага І.П. Дэйнісам гэтае перамяшчэнне не атрымалася [17].

На жаль, праца камісіі працягвалася не доўга. У кастрычніку 1921 г. яна была рэарганізавана ў Віцебскі губернскі аддзел Галоўнага камітэта па справах музеяў і аховы помнікаў мастацтва, даўніны, народнага побыту і прыроды. У яго складзе былі два пададдзелы – першы, уліку і аховы помнікаў мастацтва, даўніны і народнага побыту і другі – музейны.

За не значны тэрмін дзейнасці камісія заклала асновы помніказберагаючай і музейнай працы. У складаны час эканамічнага, ўладнага крызісу і неразбярыхі яна стала прытулкам, дзе працавалі найвыдатнейшыя прадстаўнікі віцебскай інтэлігенцыі, якія сваім досведам, аўтарытэтам стараліся зберагчы рэшткі старой культуры, актыўна ўключыліся ў будаўніцтва новай, народнай па зместу і савецкай па накіраванасці культуры.



Репозиторий ВГУ

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 1. – Арк. 48–49. Положение о губернских подотделах по делам музеев и охране памятников искусства и старины при отделах Народного образования при Губернских совдепах
2. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 3. Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі (10.02. 1920 г.)
3. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 27. Пратакол ад 28.12. 1920 г.
4. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 9(абарот). Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі (17.04. 1920 г.)
5. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 21. Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі (22.06. 1920 г.)
6. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 17. Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі
7. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 6. Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі
8. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 5. Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі
9. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 3. – Арк. 14. Отчеты, доклады, сведения Витебской губкомиссии по охране памятников
10. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 17. Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі
11. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 25 (абарот). Аб стварэнні музея новых мастакоў (новых художников)
12. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 23. Пратакол ад 29.06. 1920
13. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 13 (абарот)
14. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 21. Отчеты, доклады, сведения
15. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 2. – Арк. 5. Пратаколы пасяджэнняў Віцебскай губкамісіі Ад 17.02. 1920 г.
16. ДАВВ. – Фонд 1947. – Воп. 1. – Спр. 6. – Арк. 91–93. Ліст у Прэзідыум Губвыканкама ад 20.09. 1921 г.

**Киселева М.С.**

## ТИПОЛОГИЧЕСКОЕ РАЗНООБРАЗИЕ СЕЛЬСКИХ УСАДЕБ БЕЛАРУСИ (на примере Витебской области)

Минск, Республика Беларусь

Окружающая среда является одним из основных критериев туристического предложения в Беларуси. Однако без зданий и сооружений, сама по себе среда не в состоянии обеспечить выполнение всех функций туристической деятельности. Поэтому архитектуре в сельском туризме придается особое значение еще и в связи с тем, что специфика местной архитектуры становится неотъемлемой составляющей “туристического продукта”. Особенности архитектуры зданий и сооружений сельских усадеб должны вносить более существенный вклад, чем это имеет место сейчас, в развитие туризма в Республике Беларусь. Стоит отметить, что сельские усадьбы это результат народного зодчества, потому что практически ни один хозяин при строительстве или реконструкции не обращался к специалистам.

В настоящее время формируется типология сельских усадеб,



Репозиторий ВГУ